*У “маладую” прыбіралі мужчыну, у "маладога" - жанчыну*» (запісана ў в. Кірава ад Каляды Надзеі Іванаўны, 1931 г. н.).

Такім чынам, прыведзеныя матэрыялы па вясельнай абраднасці адной з вёсак Брагінскага раёна дэманструюць багацце лакальных традыцый, звязаных як з песенным суправаджэннем, так і з пэўнымі абрадавымі дзеяннямі.

**Спіс літаратуры**

1 Фядосік, А. С. Беларуская сямейна-абрадавая паэзія / А. С. Фядосік / навук. рэд. А. С. Ліс. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1997. – 126 с.

*УДК 392.1(476.2-37Светлагорск)*

**В. У. Жукоўская**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

## РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННЫЯ АБРАДЫ І ПЕСНІ СВЕТЛАГОРСКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*Артыкул прысвечаны апісанню радзінна-хрэсьбінных абрадаў і песень Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці. На аснове апублікаваных фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў, запісаных у палявых экспедыцыях, разглядаюцца асноўныя структурныя моманты мясцовага радзінна-хрэсьбіннага абрадавага комплексу, прыводзяцца тэксты песень.*

Радзінна-хрэсьбінная абраднасць звязана з найважнейшай падзеяй у жыцці кожнага чалавека – нараджэннем дзіцяці. Адсюль была невыпадковай павышаная ўвага да стану цяжарнай жанчыны, яе паводзін. «У народнай культуры дзеці спрадвечна лічыліся Божым дарам, дабраславеннем сям’і, былі ўвасабленнем шчасця, з імі звязваліся надзеі на бессмяротнасць – прадаўжэнне роду» [1, с. 5]. Варта адзначыць, што радзінна-хрэсьбінная абраднасць падзялялася на 3 перыяды: дародавы, родавы і пасляродавы.

Надзвычай важным у радзінна-хрэсьбіннай абраднасці з’яўляўся перыяд падрыхтоўкі да родаў. У сістэме мясцовых народных вераванняў важнае месца займаюць забароны і прадпісанні для цяжарнай жанчыны. Здароўе немаўляці, яго знешні выгляд, якасці характару, лічылася, у многім залежаць ад таго, як будзе паводзіць



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сябе жанчына-парадзіха ў жыцці. У сувязі з гэтым мясцовыя жыхары і звярталі ўвагу на ўчынкі і дзеянні цяжарнай жанчыны. Паводле народных меркаванняў, менавіта ад яе паводзін будуць залежаць у будучым здароўе і лёс немаўляці. Напрыклад, жанчына, знаходзячыся ў цяжарным стане, не дазваляла сабе гаварыць дрэнна пра іншых людзей, шкодзіць ім у чым-небудзь, зайздросціць: «Цяжарная жанчына павінна паводзіць сябе прыстойна: ні абражаць брыдкімі словамі людзей, ні рабіць шкоды, ні красці. Глядзець трэба на прыгожых і добрых людзей. Не быць зайздрослівай» (в. Каралеўская Слабада) [2, с. 337].

Асабліва нельга было цяжарнай жанчыне выконваць тыя дзеянні, што маглі сапсаваць знешнасць дзіцяці або выклікаць у яго хваробу: «Калі абрэжа бярэменная валасы, то дзіця народзіцца лысае і доўга валасы не вырастуць. А калі што-небудзь рэзаць ці секчы ў нядзелю, то дзіця будзе з “заячай губой”» (в. Печышчы) [2, с. 340]. Цікавым было яшчэ і тое, што калі цяжарная жанчына прыходзіла штосьці пазычаць да людзей, то ёй услед трэба было кінуць кавалак хлеба, што было звязана менавіта з тым, чым будзе харчавацца дзіця: «Калі цяжарная жанчына прыйдзе ў хату чаго-небудзь пазычыць, а ў вас таго няма, то трэба за ёй кінуць кавалачак хлеба. Нельга было кідаць вугаль, бо дзіця будзе есці вуглі ды мел. А калі нічога не дадзіце, то ў вас будуць мышы есці ваш скарб» (в. Каралеўская Слабада) [2, с. 337].

Адным з элементаў пасляродавага перыяду з’яўляюцца адведкі. Да жанчыны-парадзіхі прыходзілі яе сяброўкі і прыносілі ў падарунак адзенне для немаўляці, а таксама стравы, якія самі гатавалі.

Звычайна, калі жанчына ўжо нарадзіла дзіця, то прыходзілі яе адведваць самыя блізкія людзі: «Прывозяць рожаніцу дамой і прыходзяць в атведкі толькі жанчыны. Прыносяць усю прыгатаваную страву, рожаніца не павінна гатаваць» (в. Лядцы) [2, с. 338]. Віншавалі жанчыну-маці і спявалі песні, у якіх гучалі матывы ўслаўлення нованароджаных (дзяўчынкі ці хлопчыка):

Іванька і Іванька,
Што ж вам Бог даў?
Аль сына, аль сына,
Альбо дачушку?
Калі сын, калі сын,
Будзе пісаць.
Калі дочка, калі дочка,
Будзе вышываць.
Калі сын, калі сын,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Калыбелька разрісованая,
Калі дочка, калі дочка,
Калыбелька лубяная (в. Печышчы) [2, с. 340].

Даўней роды адбываліся з дапамогай бабкі-павітухі, на ролю якой запрашалі жанчыну ва ўзросце, якая ўжо сама страціла здольнасць нараджаць: «Ісці ў бабы мела права жанчына, якая сама выйшла з дзетароднага ўзросту» (в. Славань) [2, с. 341]. Менавіта бабка-павітуха першай купала немаўля, бо, як адзначылі інфарманты, «маці родная рожаніцы не павінна купаць дзіця» (в. Лядцы) [2, с. 338]. У в. Лядцы Светлагорскага раёна абавязкова ў ваду для купання ў драўляныя начоўкі клалі, акрамя лекавых траў, хлеб. Як растлумачылі мясцовыя жыхары, яго «клалі для таго, каб дзіця не пужалася вады» [2, с. 338].

Выбіралі кума і куму, якім адводзілася самая ганаровая функцыя – пахрысціць дзіця ў царкве. Паводле сведчанняў інфармантаў, за куму нельга было браць незамужніх: «Шчыталася, што кумою нельга браць незамужнюю дзяўчыну, таксама маладой дзеўке нельга было хрысціць першую дзяўчынку, бо тады сваіх дзяцей не будзе» (в. Печышчы) [2, с. 338].

Бацька і маці немаўляці, калі кумы выпраўляліся хрысціць іх дзіця, заставаліся дома: «Радзіцелі ў цэркву не ездзілі, а гатовілі ўсё дома» (в. Печышчы) [2, с. 341]. Падчас хрэсьбіннага застолля кум, кума і бабка-павітуха займалі цэнтральнае месца за сталом. Як гаварылі ў народзе, іх садзілі на куце, а потым рассаджваліся астатнія госці.

Бабіна каша – важны кампанент пасляродавага перыяду – непасрэдна звязана з хрэсьбінным застоллем. Звычайна гатавала яе бабка-павітуха і прыносіла на хрэсьбіны. Зыходзячы з народных павер'яў, хто болей грошай пакладзе на кашу, той і разбівае. Кашу рыхтавалі з грэчкі, рысу ці з пшана. Хрэсьбіннае застолле суправаджалася прыпеўкамі:

Мяне маменька радзіла,
Туга ножанькі звіла.
На раду яна сказала,
Штоб танцорачкай была
Мяне маменька радзіла
У поле пад асінкаю.
На раду яна сказала,
Будзеш звацца Зінкаю (в. Лядцы) [2, с. 339].

Абрад разбівання бабінай кашы – займальны, але адказны момант у радзінна-хрэсьбіннай абраднасці. Бабка-павітуха, якая рыхтавала абрадавую страву, павінна была «прадаць» яе куму. Менавіта ён павінен быў разбіць гаршчок з кашай, але права такое трэба было заслужыць.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Усе госці клалі на кашу грошы, пасля кум разбіваў гаршчок з кашай і раздаваў яе ўсім прысутным. Выконвалі песні, у якіх матыў адорвання з боку гасцей нованароджанага, быў галоўным:

Ой, учора, мае кумочкі,
У нас радзінкі былі.
А сягоння, мае кумочкі,
Мы на хрэсьбінкі прыйшлі.
Не шкадуйце, мае кумочкі,
Па рубельчыку даць.
То мы будзем, мае кумочкі,
Да аўторка гуляць
Не шкадуйце, мае кумочкі,
Па каровачцы даць,
То мы будзем, мае кумочкі,
Усю нядзельку гуляць (в. Печышчы) [2, с. 341].

Сціплыя звесткі прадстаўлены ў зборніку «Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў (на матэрыяле фальклору Гомельскай вобласці)» [2] па радзінах Светлагоршчыны, у прыватнасці па магічных дзеяннях, звязаных з чарапкамі ад гаршка з кашай, які разбівалі. Сэнс гэтых маніпуляцый быў скіраваны на забеспячэнне дзетанараджэння: «Чарапкі клалі на галаву маладым (гасцям), каб яшчэ дзеці раджаліся» (в. Баравікі) [2, с. 341].

Заканчваліся хрэсьбіны тым, што ў некаторых вёсках вазілі ў магазін бабку-павітуху, каб яна ўсіх пачаставала («У канцы хрэсьбін бабку “цягалі на баране”, а яна падганяла іх дубцам ці венікам» (г. Светлагорск) [2, с. 336], а ў іншых – «садзілі на каляску кумоў і трэбуюць магарыч, і назад прывозяць» ( в. Чыркавічы) [2, с. 343].

Прыведзеныя матэрыялы па радзінна-хрэсьбіннай абраднасці Светлагорскага раёна пераконваюць у захаванні агульнатрадыцыйных элементаў, а таксама ў тым, што мае месца і мясцовая спецыфіка абрадаў і песень.

**Спіс літаратуры**

1 Кухаронак, Т. І. Радзіны і маленства ў традыцыйнай культуры беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск: Беларуская навука, 2017. – 140 с.

2 Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў (на матэрыяле фальклору Гомельскай вобласці) / аўтары-ўкладальнікі В. С. Новак, В. К. Шынкарэнка, А. А. Кастрыца, А. М. Воінава, С. А. Вяргеенка, А. М. Палуян, А. У. Партнова-Шахоўская. – Гомель: Барк, 2013. – 380 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ